Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№30 (308) СУБОТА, 21 снежня 1957 г. Цана 20 кап

ДА СЕСІІ ЗАСТАЛОСЯ 24 ДНІ

## НАПЯРЭДАДНІ ЭКЗАМЕНАЎ

Набліжаецца зімовая экзаменацыйная сесія. Па выніках яе можна будзе меркаваць і аб рабоце дэканатаў, партыйных, комсамольскіх і профсаюзных факультэцкіх арганізацый. Цяпер асабліва востра стаіць пытанне аб самастойнай рабоце студэнтаў. Таму дэканаты павінны асабліва старанна наглядаць за тым, каб не дапускалася перагрузка студэнтаў лекцыйнымі заняткамі. Факты сведчаць, што на многіх факультэтах расклад заняткаў пабудован без уліку таго, што ўжо ідзе другая палова снежня. Маюцца выпадкі, калі нават дапускаюцца адхіленні ад прынятай колькасці гадзін, а факультатыўныя заняткі, як правіла, выносяцца пазалекцыйныя гадзіны. Безумоўна, пры такіх умовах у студэнтаў амаль не застаецца часу для самастойнай работы.

Па універсітэту на канец снежня плануецца многа розных мерапрыемстваў, адбіраючых у студэнта дарагі для яго час.

Зусім не улічвае напружанасць перадэкзаменацыйных дзён кафедра фізічнага выхавання Рабочыя планы яе ідуць уразрэз з тымі запатрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да студэнтаў напярэдадні экзаменаў. Ад удзелу ў грамадскіх мерапрыемствах і фізкультурнай рабоце неабходна вызваліць у першую чаргу тых студэнтаў, якія не спраўляюцца са сваім асноўным абавязкам—вучобай. Нельга дазваляць студэнтам, якія займаюцца грамадскай работай, вучыцца горш, чым другім студэнтам. А такія выпадкі ва універсітэце нярэдкія. Так, на фізмаце, на III курсе аддзялення матэматыкі комсоргам быў выбран студэнт Бачыла, меўшы акадэмічную запазычанасць яшчэ з летняй экзаменацыйнай сесіі.

Неабходна адзначыць, што у гэтым годзе ў нас вельмі многа студэнтаў, маючых акадэмічную запазычанасць яшчэ з мінулых семестраў. Сярод іх ёсць і такія, як Ж. Макацэвіч (3 курс аддз. рус. мовы і літаратуры), Душкевіч (4 курс аддзялення журналістыкі), якія не здалі яшчэ экзамены больш чым па 4 прадметах. Ім, безумоўна, не месца ва універсітэце. У БДУ няма факультэтаў дзе-б не было студэнтаў, якія з года ў год пераводзяцца з курса на курс з акадэмічнай запазычанасцю. Гэта гаворыць аб тым, што партыйныя і комсамольскія факультэцкія арганізацыі недастаткова вядуць барацьбу супроць падобных фактаў.

Для ліквідавання недахопаў, перашкаджаючых паспяховаму правядзенню экзаменацыйнай сесіі, на многіх факультэтах былі праведзены партыйныя сходы і курсавыя комсамольскія сходы.

На філалагічным факультэце ў лістападзе адбыўся актыў студэнтаў і выкладчыкаў. Актыў абмеркаваў рад пытанняў аб становішчы вучэбна-выхаваўчай работы. Рашэнні актыву ўжо адыгралі станоўчую ролю у наладжванні дысцыпліны і сярод студэнтаў і сярод выкладчыкаў.

Пажадана, каб такія сходы прайшлі на другіх факультэтах. Значную дапамогу дэканатам, партыйным і комсамольскім бюро факультэтаў у час падрыхтоўкі да экзаменацыйнай сесіі аказвае насценны друк. У насценнай газеце гістарычнага факультэта, напрыклад, выступаюць выдатнікі вучобы, якія дзеляцца сваім вопытам у падрыхтоўцы да экзаменаў, у якіх многа парад выказана студэнтам першага курса. Безумоўна, гэта прынясе карысць.

Вялікае значэнне мае правільнае і своечасовае правядзенне калёквіўмаў і кансультацый. Кафедрам і дэканатам патрэбна старанна сачыць за тым, каб прынятыя планы правядзення іх не заставаліся планамі на паперы, а ператвараліся ў жыццё. Вялікую ўвагу гэтаму пытанню ўдзялілі кіраўнікі фізіка-матэматычнага факультэта.

Перадэкзаменацыйныя кансультацыі тут, як правіла, праводзяцца рэгулярна, прычым асаблівая ўвага ўдзяляецца студэнтам першага курса.

У адпаведнасці з задачамі прадстаячай зімовай экзаменацыйнай сесіі павінны быць зараз накіраваны і намаганні выхавацеляў груп. Палітыка-выхаваўчая работа у гэтыя дні не павінна згортвацца, а, наадварот, усямерна ўзмацняцца.

Паспяховае правядзенне зімовай экзаменацыйнай сесіі—галоўная задача, стаячая перад калектывам студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта. Яшчэ ёсць магчымасць многае выправіць і ліквідаваць. Галоўнае—не пускаць работу па падрыхтоўцы да зімовай сесіі на самацёк.

## НАШЫ СПРАВЫ

Я і яшчэ сем студэнтаў нашага курса жывем у інтэрнаце. Усе мы імкнемся добра і рацыянальна размеркаваць свой час.

Кожны дзень з 9 гадзін раніцы усе мы, акрамя дзяжурнага, займаемся у пакоі пры інтэрнаце, ці ў бібліятэцы імя Леніна, або ў кабінеце.

Самым хвалюючым для нас першакурснікаў з'яўляюцца прадстаячыя экзамены. Экзамены асабліва хвалююць нас таму, што яны будуць першымі паказчыкамі тых ведаў, якія мы атрымалі за першыя месяцы вучобы ва універсітэце.

З самага пачатку нашай вучобы у БДУ. вялікую дапамогу аказалі нам студэнты старэйшых курсаў. Яны падзяліліся вопытам сваёй работы, якога у нас яшчэ няма. Таму мы уважліва прыслухоўваемся да усіх парад старшакурснікаў. Дзякуючы гэтаму мы лепш падрыхтуемся да прадстаячых экзаменаў.

**Святлана СІМАНЬКОВА,**
**студэнтка І-га курса гістарычнага факультэта.**

## На адных практычных...



Субота. У трэцекурснікаў гістарычнага факультэта з гэтым днём звязана не толькі адчуванне прадстаячага адпачынку, але і...

Першыя дзве гадзіны лекцый у гэты дзень адведзены для практычных заняткаў: у першай групе —па новай гісторыі, у другой— па палітэканоміі.

«Консульства і імперыя у Францыі»—гэтую тэму падрыхтавалі студэнты першай групы. Паглядзім-жа, як адказваюць трэцекурснікі.

Адзін за другім выступаюць студэнты Бакштанаў, Васільеў, Егораў. Прафесар Нікалай Паўлавіч Палетыка задаволен іх адказамі.

Але вось выкладчык называе прозвішча Людмілы Жэлкоўскай. Дзяўчына падрабязна пачынае расказваць аб войнах Напалеона. Бачна, што яна рыхтавалася да заняткаў. Аднак. на дадатковыя пытанні Людміла змагла адказаць толькі пры дапамозе выкладчыка.

Яшчэ больш няўпэўнена адказвала Л. Федаровіч. На асобныя пытанні, у прыватнасці,—«На што разлічваў Напалеон І у час кантынентальнай блакады Англіі?»— яна зусім не магла даць адказу.

Мы зацікавіліся, чаму асобныя студэнты дрэнна адказвалі на практычных занятках па новай гісторыі. Прычыну не цяжка было адшукаць, калі пазнаёміцца з журналам выкладчыка. Напрыклад, супроць прозвішча Л. Жэлкоўскай стаяць дзве нездавальняючыя адзнакі і адзін пропуск. Амаль тое-ж самае можна сказаць у адносінах студэнтаў тт. Леўхненкі, Крыштапава, Гербста.

— Гэтыя таварышы і некаторыя другія,—гаворыць прафесар Палетыка,—лічаць практычныя заняткі другараднай справай.

Сярод большасці студэнтаў назіраецца другая тэндэнцыя — імкненне да простага зазубрывання фактычнага матэрыялу з дапаможніка. Напрыклад, па сённяшняй тэме акрамя праграмнага матэрыялу можна было выкарыстаць раманы Л. Талстога «Вайна і мір», Л. Нікуліна «Расіі верныя сыны». Гэта дапамагло-б студэнтам лепш разабрацца у асобных пытаннях тэмы, лягчэй запомніць фактычны матэрыял.

**В. ДАШУК.**

## ПАРАДЫ ПЕРШАКУРСНІКАМ

Хутка экзаменацыйная сесія. Для некаторых студэнтаў яна з'явіцца першай пробай сіл.

У зімовую сесію сярод іншых экзаменаў будзе экзамен і па асновах літаратуразнаўства. Гэта даволі складаная навука, і ад студэнтаў яна патрабуе упартай і настойлівай працы. Цяжкасць заключаецца у тым, што студэнт павінен ведаць як мага больш твораў мастацкай літаратуры і на аснове гэтага грунтаваць тэарэтычныя палажэнні і вывады, а таксама ў тым, што студэнт тут сустракаецца з шэрагам новых паняццяў, якія патрабуюць дэталёвага вывучэння. Акрамя гэтага, ён абавязан памятаць вялікую колькасць прыкладаў. Гэта, вядома, цяжка. Таму трэба авалодваць прадметам паступова.

Цяжкасць падрыхтоўкі да экзаменаў сказваецца і у тым, што сістэма выкладання у ВНУ і школе розніцца паміж сабою. У нас асноўны ўпор робіцца на самастойную працу студэнтаў.

Аднак некаторыя першакурснікі дрэнна гэта разумеюць.

Асабліва небяспечна склалася становішча на першых курсах беларускага аддзялення.

Вядома, што практычныя заняткі уводзяцца для таго, каб дапамагчы паступова авалодаць дысцыплінай, паглыбіць веды і праверыць падрыхтаванасць да экзаменаў. Нажаль, ствараецца уражанне, што першакурснікі беларускага аддзялення не рыхтуюцца да практычных заняткаў, а калі і падрыхтуюцца, то не могуць тэарэтычныя палажэнні раскрыць на канкрэтных мастацкіх творах. Сорамна, але справа даходзіць да таго, што некаторыя студэнты не могуць вызначыць сюжэт толькі што прагледжанага кінофільма.

Праўда, калі чалавек ставіць перад сабой мэту авалодаць навукай, веды — справа нажыўная. Горш тады, калі студэнт не хоча працаваць. А што гэта так, сведчаць і другія факты.

У групах рускага аддзялення, напрыклад, студэнты Салееў, Бедчар, Маркелава і іншыя нядобрасумленна адносяцца да практычных заняткаў. Некаторыя лічаць нармальнай з'явай заходзіць у аудыторыю праз 5—10 мінут пасля выкладчыка.

Студэнты аддзялення журналістыкі у гэтым годзе таксама выступаюць ніжэй сваіх магчымасцей. Мабыць і яны спадзяюцца на апошнія ночы перад экзаменам?

Усім першакурснікам трэба завастрыць увагу на экзаменацыйнай сесіі, ліквідаваць наяўныя недахопы у падрыхтоўцы да яе.

**В. КАРАБАН,**
**выкладчык тэорыі літаратуры.**

## За што крытыкавалі партбюро юрфака

Днямі партыйны камітэт універсітэта абмеркаваў пытанне аб становішчы палітыка-выхаваўчай работы на юрыдычным факультэце.

Партком адзначыў рад станоўчых момантаў у выхаваўчай рабоце са студэнтамі, як, напрыклад, імкненне выкладчыцкага складу звязаць змест лекцый і практычных заняткаў з задачамі ідэалагічнага выхавання студэнтаў, арганізацыяй лекцый і дакладаў.

Адначасова партком падвергнуў рэзкай крытыцы партыйнае бюро (сакратар тав. Юхо) за тое, што у сваёй выхаваўчай арганізацыйна-масавай рабоце яно слаба выкарыстоўвае комуністаў. Нягледзячы на тое, што на факультэце маецца адзін член партыі на 10 студэнтаў, масава-палітычныя мерапрыемствы тут праводзяцца на нізкім арганізацыйным узроўні. Мітынгі і сходы праходзяць пры слабай актыўнасці. На іх адсутнічае значная частка комуністаў.

Партбюро юрыдычнага факультэта было падвергнута крытыцы і за тое, што яно да гэтага часу не наладзіла выхаваўчай работы у інтэрнатах.

Па абмеркаванаму пытанню партком прыняў разгорнутае рашэнне.

## ПАСЕДЖАННЕ ПРАФКОМА

Адбылося чарговае паседжанне прафкома БДУ. На ім абмеркавана пытанне аб стане дысцыпліны і падрыхтоўкі да экзаменаў на 1-м курсе гістарычнага факультэта і 3-м курсе хімічнага факультэта.

Адначасова прафком рэкамендаваў профсаюзнаму бюро фізіка-матэматычнага факультэта вызваліць ад абавязкаў прафорга студэнта 2-га курса аддзялення фізікі Р. Лемеш, які не выконвае сваіх абавязкаў і мае аэкадэмічную запазычанасць.

Вырашана таксама прасіць рэктарат перавесці усе кабінеты на штотыднёвую двухзменную работу і палепшыць забеспячэнне студэнтаў харчаваннем у перыяд экзаменацыйнай сесіі.

**С. ІВАНОЎ.**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ ЧЫТАЙЦЕ

* Сесія набліжаецца
* Агляд друку
* Ажывіць работу СНТ
* Вершы нашых паэтаў
* На фізіка-матэматычным
* Венгерскі вучоны ў БДУ
* Будзем сябраваць

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ХІБА-Ж СПРАВА ТОЛЬКІ Ў МЕТАДАХ?

## Аб нездавальняючым кіраўніцтве палітыка-выхаваўчай работай на хімфаку

Відавочна, добрымі намерамі кіравалася партыйнае бюро хімічнага факультэта, выносячы даклад тав. В. Ц. Петрыкава на адкрыты партсход, прысвечаны пытанню аб удзеле прафесарска-выкладчыцкага складу у палітыка-выхаваучай рабоце са студэнтамі. Але не такі даклад патрэбны быу у даным месцы і выпадку. Гэта быў не даклад па сутнасці пытання, а хутчэй лекцыя аб некаторых, найбольш агульных прынцыпах комуністычнага выхавання моладзі. У ім цытаваліся выказванні вядомых рускіх педагогау, але нічога не гаварылася аб рабоце сваіх выкладчыкау у групах; указвалася на педагагічныя моманты у дзейнасці вялікіх рускіх хімікау, але нічога не сказана аб вопыце хімікау факультэта. Бясспрэчна добра сказау у свой час А. С. Макарэнка аб тым, што чалавек, які неахайна адносіцца да працы,—самы амаральны. Але ці дастаткова толькі паутараць гэтыя словы, калі перад калектывам факультэта стаіць праблема навучыць студэнтау прафесіянальнай акуратнасці, беражліва адносіцца да апаратуры, эканоміць рэактывы і г. д?

У дакладзе не называліся прозвішчы, не прыводзіліся адмоуныя факты, хоць яны маюць месца у жыцці факультэта. Вось чаму даклад не мог даць глебы для выступленняу, для разгортвання крытыкі і самакрытыкі у спрэчках.

Хаця у выступленнях комуністау В. І. Сцяпанава, І. Г. Цішчанкі і другіх таварышоу было выказана многа каштоуных прапаноу, але у цэлым спрэчкі насілі некрытычны характар. Усе указвалі на недахопы у палітыка-выхаваучай рабоце, але ніхто з комуністау не быу падвергнуты крытыцы.

Многія выступаючыя канцэнтравалі сваю увагу на высвятленні форм і метадау выхаваучай работы. Але хіба справа толькі у метадах? Ці-ж недастаткова ужо наяуных і выпрабаваных на практыцы форм і метадау выхаваучай работы са студэнтамі?

Прычыны слабай палітыка-выхаваучай работы на хімфаку крыюцца не у недахопе форм і метадау, а у тым, што у бягучым семестры партыйная арганізацыя да гэтай работы па сутнасці яшчэ не прыступіла.

Нельга сказаць, што на факультэце нічога не робіцца. У групах маюцца кіраунікі, праводзяцца вечары, арганізуюцца культпаходы, мітынгі. Але гэтым не можа абмежавацца ідэйна-выхаваучая работа. Узяць хаця-б работу у інтэрнаце па вуліцы Свердлова, дзе жыве больш 100 студэнтау-хімікау. Няма неабходнасці даказваць, якое вялікае выхаваучае значэнне мае работа выкладчыкау у інтэрнаце. Але, на жаль, на працягу усяго семестра ніхто з выкладчыкау не наведау інтэрнат, не пацікавіуся, чым займаюцца, як праводзяць студэнты час пасля заняткау. У інтэрнаце ніякай палітыка-выхаваучай работы не праводзіцца, студэнты прадастаулены самім сабе. Па суботах і нядзелях яны у цеснаце і тытунёвым дыме таукуцца на танцах. Шум і крыкі не супыняюцца да позняй ночы, маюць месца выпадкі п'янства і дэбашырства, у якіх не апошнюю ролю адыгрывае студэнт IV курса Кіслякоу.

Партыйнае бюро не паклапацілася аб тым, каб накіраваць увагу кіраунікоу груп, комсамольскага і профсаюзнага актыву на неабходнасць выхаваучай работы са студэнтамі, якія жывуць на прыватных кватэрах. А не пашкодзіла-б узяць прыклад з геаграфічнага факультэта, дзе такая работа дауно праводзіцца.

Агульнавядома, што цэнтрам палітыка-выхаваучай работы з'яуляецца студэнцкая група. Асноуная цяжкасць работы ляжыць на прафесарска-выкладчыцкім складзе. Важнае значэнне тут мае кантроль за якасцю лекцый, за іх тэарэтычным і ідэйным узроунем. Але партбюро і адказны за палітыка-выхаваучую работу А. С. Баркан не арыентавалі кафедры на гэта, не пацікавіліся канкрэтна, як выкарыстоуваюцца данныя спецыяльных навук для выкрыцця ідэалізма, для пацвярджэнняу дыялектычнага матэрыялізма. Работнікі кафедр хімфака асабліва многа могуць зрабіць для узбраення студэнтау ведамі па атэістычнай прапагандзе.

На хімічным факультэце выхаваучая работа у групах у гэтым годзе пачалася позна. І нават пры такім становішчы кантроль за ёю адсутнічае, дапамога кіраунікам не наладжана, абмен вопытам не практыкуецца. У групах мала праводзіцца гутарак на палітычныя тэмы. У выніку студэнты часта не ведаюць важнейшых матэрыялау сучаснасці. Так, напрыклад, студэнты І-га курса (кіраунік тав. Улязава) нічога не ведалі аб апошняй гутарцы Н. С. Хрушчова з амерыканскімі карэспандэнтамі, не чулі яны аб рашэнні снежаньскага Пленума ЦК КПБ па пытанню ідэалагічнай работы сярод моладзі.

На факультэце мала праводзіцца лекцый і дакладау на грамадска-палітычныя тэмы. Запрашэнне кваліфікаваных лектарау з таварыства па пашырэнню палітычных і навуковых ведау зусім не практыкуецца. Партыйнае бюро мірыцца з тым фактам, што ніхто з прадстаунікоу кафедр не выступае з палітычнымі дакладамі. Ды і самі члены партбюро не выступаюць з такімі дакладамі.

Выхаваучая работа са студэнтамі—адна з самых складаных. Таму поспех у ёй могуць забяспечыць толькі патрабавальнасць, планамернасць, сістэматычнасць, карпатлівасць.

М. АРЛЕНКА.



Нядауна геолага-геаграфічны факультэт наведау венгерскі прафесар-геолаг Пап. Асабліва моцнае уражанне на яго зрабіў наш геалагічны музей. Захапленне ім прафесар выказау двума словамі: «Вельмі добра!».

На развітанне вучоны сказаў:

— Навуковыя сувязі — адно з галоўнейшых звенняў міжнародных зносін, таму наша задача— штодзённа іх мацаваць. Нас, геолагаў, аб'едноувае асабліва адна рэч — прырода, якую мы, вывучаем.

НА ЗДЫМКУ: Праф. Пап (злева) у геалагічным музеі БДУ.

Фото А. ЛУКАШОВА.

Генадзь БУРАЎКІН.

## НА БАЛТЫЦЫ

Я пабыу на туманнай Балтыцы,
На прасторы вятроу і хваль,
Дзе за краем нябес хаваецца
Легендарны дзевяты вал.

Як карункамі, пенай белаю
Тут прыбраныя берагі.
Перад штормамі хмаркай
смелаю
Чайкі носяць крыкі тугі.

Ветры дыхаюць блізкай сцюжаю,
Хвалі грозна у далі гудуць.
Толькі смелыя, толькі дужыя
З хісткай палубы не сыйдуць,

Пераломяць стыхію-указчыцу,
І тады пырхнуць чайкі ўразлёт,
Да барта будуць хвалі
лашчыцца,
Сонца кінецца ў люстра вод.

А навокал—вятры салёныя
І прастору канца няма...
Не, пра мора песні натхнёныя
Мы, спяваем, сябры, нездарма!

## СУСТРЭЧА НАМ СПАДАБАЛАСЯ

*На днях па ініцыятыве комсамольскага бюро І курса аддзялення журналістыкі была арганізавана сустрэча са студэнтамі 5-га курса гэтага-ж аддзялення. Выступілі выпускнікі, выдатнікі вучобы і актыўныя грамадскія работнікі Галіна Марунова, Вацлаў Мацкевіч і Наталля Зенчанка.*

*— Як старэйшы таварыш,— сказала Галіна Марунова,— раю рэгулярна канспектаваць лекцыі. Запісваць неабходна толькі галоунае. З першага-ж года вучобы прывыкайце сістэматычна працаваць над той літаратурай, якую рэкамендуюць выкладчыкі. Прывучайце сябе да паслядоунасці, каб у вашай вучобе не было штурмаушчыны.*

*—Хачу вам падказаць,—звярнууся да будучых журналістаў Вацлау Мацкевіч,—актыўна удзельнічаць у нашай шматтыражнай газеце «Беларускі універсітэт», каб набываць неабходныя навыкі газетнай работы.*

*Слова узяла Наташа Зенчанка. — Безумоўна, усе вы чытаеце мастацкую літаратуру. Прывыкайце рабіць выпіскі і паметкі з прачытаных кніг. Па-першае, гэта вам спатрэбіцца пры вывучэнні праграмнага матэрыялу. Па-другое, як журналістам, вам неабходна цікавіцца кожным творам, яго ідэйнымі асаблівасцямі і мастацкім майстэрствам.*

*Безумоуна, гэта сустрэча пойдзе на карысць студэнтам першага курса.*

*В. КАВАЛЬКОЎ,*
*студэнт І-га курса аддзялення журналістыкі.*

## Сход совета СНТ

11 лістапада адбыўся справаздачна-выбарчы сход совета СНТ універсітэта, на якім была заслухана справаздача старшыні Совета СНТ і выбраны новы совет СНТ.

У справаздачным дакладзе старшыня совета СНТ тав. Сцёпін адзначыу, што за справаздачны перыяд працавала 56 навукова-даследчых гурткоў, у рабоце якіх прымала удзел каля 1000 студэнтаў. Удзялялася некаторая ўвага навуковым даследванням студэнтау, звязаным з запатрабаваннямі прадпрыемстваў.

Як лепшыя у дакладзе адзначаны гурткі гідрабіялогіі (кіраунік прафесар Г. Г. Вінберг), сістэматыкі раслін (кіраунік прафесар Н. А. Дарожкін), замежнай літаратуры (кіраунік дацэнт Д. Е. Фактаровіч і выкладчык Б. П. Міцкевіч).

Нездавальняюча працавалі тры гурткі пры кафедры рускай мовы; адзін з гэтых гурткоу (кіраунік дацэнт А. Я. Бірала) за увесь год не заслухау ні аднаго даклада.

Было адзначана, што на гістарычным факультэце большасць гурткоу не працуе, паседжанні не праводзяцца. Работа студэнтау, як правіла, зводзіцца да напісання курсавых і дыпломных работ.

У рабоце СНТ меліся і іншыя недахопы. Совет недастаткова глыбока унікау у работу навукова-даследчых гурткоу, тэматыка дакладау амаль не абмяркоувалася, зусім не праводзілася работа па папулярызацыі студэнцкай навуковай работы.

Сход патрабаваў ад новага складу СНТ ліквідаваць адзначаныя недахопы.

І. ГАЛЕЙ,
студэнтка II курса
філалагічнага факультэта.



## У дзень выбараў

*Марозная раніца 15 снежня. Дзесяткі людзей запауняюць вестыбюль біякорпуса, дзе размешчан участак № 1 па выбарах у народныя суды. Тут галасуюць студэнты, якія пражываюць у інтэрнатах па вуліцы Бабруйскай. Студэнты 3-га курса фізіка-матэматычнага факультэта Уладзімір Качкоу і Ала Ліпская першымі атрымалі бюлетэні для галасавання.*

*НА ЗДЫМКУ: Студэнты-філолагі Міхаіл Канапліцкі, Іван Філістовіч і Уладзімір Карызна ў час галасавання ля выбарчай урны.*

*Фото і тэкст*
*В. ДАШУКА.*

# *ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ* ГУРТКА

*У 1947 годзе ва універсітэце упершыню пачаў працаваць гурток беларускай дыялекталогіі. Гуртко́ўцы тут вывучаюць дыялекты беларускіх гаворак. На працягу існавання гуртка нязменным яго кіраунікам з'яўляецца кандыдат філалагічных навук, дацэнт Марыя Андрэеуна Жыдовіч.*

*Тэматыка гуртка вельмі цікавая і разнастайная. Яна уключае вывучэнне марфалагічных і фанетычных асаблівасцей беларускіх дыялектау, а таксама лексікі і сінтаксіса.*

*Гурток штогод арганізоўвае экспедыцыі ў розныя раёны Беларусі. Мэта удзельнікау экспедыцыі—заўважыць і правільна запісаць своеасаблівыя рысы дыялекту таго ці іншага населенага пункта. Работа гэта карпатлівая і патрабуе вялікай увагі і адказнасці. Таму падрыхтоука да экспедыцыі праводзіцца на працягу ўсяго навучальнага года. Удзельнікі гуртка загадзя вывучаюць «праграму», знаёмяцца з этнаграфічнымі, археалагічнымі і гістарычнымі данымі тых раёнау, якія вызначаны для абследавання.*

*Дыялектныя матэрыялы шырока выкарыстоўваюцца для дыпломных, курсавых работ, а таксама для семінарскіх дакладаў.*

*Студэнты гуртка ўдзельнічаюць не толькі ва універсітэцкіх экспедыцыях, але таксама прымаюць актыўны ўдзел і ў экспедыцыях, арганізаваных Акадэміяй Навук БССР.*

*У далейшай сваёй дзейнасці гурток будзе арганізоуваць экспедыцыі па збіранню матэрыялу для складання абласнога слоўніка.*

*За 10 год свайго існавання з гуртка выйшлі пяць кандыдатаў філалагічных навук: Рамановіч, Лапау, Анічэнка, Хацкевіч, Шакун. Падрыхтавалі дысертацыі для абароны на атрыманне звання кандыдата філалагічных навук тт. Мяцельская, Камароускі, Блінава, Мурашка, Бурак, Квяткоўская і інш. Заканчвае работу над дысертацыяй Юрэвіч.*

*А. ЛАЗОЎСКІ, студэнт 4-га курса філалагічнага факультэта.*

